УДК 398.91(476)

*І.С. КАНАВАЛАВА*

# ПРАДМЕТНА-ТЭМАТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ АНТЫПРЫКАЗАК

*У артыкуле прапануецца класіфікацыя антыпрыказак па прадметна-тэматычных групах, якія суадносяцца паводле іерархіі прадметных тэм па крытэрыях "род – від", "агульнае – прыватнае", "частка – цэлае". Беларускія антыпрыказкі паводле зместу дыферэнцыруюцца на 9 галоўных прадметна-тэматычных блокаў: "Дзяржава. Улада. Палітыка", "Эканоміка. Фінансы", "Вытворчасць. Праца", "Жыццё грамадства. Сацыяльныя з'явы, працэсы", "Свет чалавека. Існаванне, асаблівасці, адносіны", "Чалавек. Людзі. Зносіны", "Духоўнае жыццё", "Свет. Быційныя катэгорыі. Абстрактныя паняцці", "Непазнанае". Кожны з блокаў падзяляецца на некалькі прадметна-тэматычных груп, якія, у сваю чаргу, размяжоўваюцца на падгрупы па больш вузкіх прадметных тэмах.*

## Уводзіны

У сучаснай беларускай мове, як і ў многіх іншых еўрапейскіх мовах, пачынаючы з другой паловы XX ст. назіраюцца істотныя змяненні ў функцыях і спосабах ужывання прыказак, выкліканыя істотнымі сацыяльнымі і культурнымі зрухамі ў жыцці чалавека і грамадства. Новыя рэаліі знаходзяць сваё адлюстраванне ў парэміялагічным фондзе мовы. Адбываюцца актыўныя працэсы трансфармацыі формы і зместу прыказак, прыстасаванне і прымяненне іх да новых сітуацый сучаснага сацыяльнага і культурнага жыцця. Адзін з такіх працэсаў – пераўтварэнні прыказак з мэтай іх парадыравання, высмейвання, што тлумачыцца сучаснымі парэміёлагамі як выкананне свайго роду "сацыяльнага заказу" па "асучасніванню" традыцыйных парэмій [1, с. 14]. Адзінкі, якія ўтвараюцца ў выніку парадыйных або жартаўлівых трансфармацый вядомых парэмій, у сучаснай парэміялогіі прынята называць "антыпрыказкі" [2].

Агульная колькасць зафіксаваных аўтарам артыкула ў розных крыніцах беларускіх антыпрыказак складае 1000 адзінак, якія адрозніваюцца паводле зместу і тэматычнай прыналежнасці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне прадметна-тэматычных груп беларускіх антыпрыказак.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне**

Змест і тэматыка антыпрыказак вызначаюцца сваёй дуалістычнасцю. З аднаго боку, у антыпрыказках высмейваюцца традыцыйныя погляды на свет і духоўныя каштоўнасці, а з другога, адлюстроўваюцца новыя эпістэмалагічныя назіранні і этычныя нормы, якія процістаўляюцца старым, аджыўшым. Таму вывучэнне зместу і тэматыкі антыпрыказак мае дзве задачы: па-першае, вызначэнне тых тэматычных сфер парэміялагічнага фонду мовы, рэаліі якіх высмейваюцца ў антыпрыказках, а па-другое, дыферэнцыяцыя антыпрыказак на тыя прадметна-тэматычныя групы, якія адпавядаюць новым, сучасным рэаліям сацыяльнага і духоўнага жыцця.

Для вырашэння першай задачы патрабуецца выяўленне тэматычнай прыналежнасці прыказак, якія з'яўляюцца зыходнымі адзінкамі антыпрыказак, паколькі аб'ектам асмяяння і парадыравання ў антыпрыказках выступаюць тыя матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці сацыяльнага і духоўнага жыцця, якія адлюстраваны ў адзінках парэміялагічнага фонду беларускай мовы і з'яўляюцца эпістэмалагічна актуальнымі, значнымі для сучасных носьбітаў мовы: "радзіма" (*Дарагая тая хатка, за якую заплаціў падаткі ← Дарагая тая хатка, дзе радзіла (нарадзіла) мяне матка*); "жыццё чалавека" (*Два вякі жыць не будзеш: надакучыць ← Два вякі жыць не будзеш*); "здароўе" (*Здароўе за грошы не прадасі ← Здароўе мілейшае за грошы*); "бацькі і дзеці" (*Чым бы дзіця ні цешылася, абы бацькі не плакалі ← Чым бы дзіця ні цешылася, абы (толькі б) не плакала*); "выхаванне" (*Гні дрэва, пакуль лаза ← Гні дрэва, пакуль яно маладое*); "сяброўства" (*З кім павядзешся – ад таго і захварэеш ← З кім павядзешся, ад таго <і> набярэшся*); "дабрабыт" (*Хочаш жыць – умей лётаць... па ўрачах і аптэках ← Хочыш жыць – умей круціцца*); "праца" (*Што пасееш, тое і збяруць суседзі па дачы ← Што пасееш, то (тое) і пажнеш*); "веды" (*Колькі не вучыся, усё роўна болей за тэлевізар ведаць не будзеш ← Век жыві – век вучыся*); "умельства" (*Не багі аб гаршкі апякаюцца ← Не багі гаршкі лепяць*); "досвед" (*Лепш адзін раз убачыць, чым пачуць і аглыхнуць ← Лепей <адзін> раз убачыць, чым сто разоў пачуць*); "слова" (*Слова не верабей: гадзіць без стомы ← Слова не верабей, выпусціў (выпусціш, вылеціць, вылецела) – не зловіш*); "надзея" (*Хто шукае, той і ашукваецца < Хто шукае, той знаходзіць*); "знешнасць і сутнасць чалавека" (*Сустракаюць па вопратцы, праводзяць – як могуць ← Па адзенні страчаюць (сустракаюць), а па розуму праводзяць*) і г.д.

Калі прыказкі, паводле вядомага парэміёлага А. Дандзіса, з'яўляюцца "люстэркам культуры" і жыцця народа [3, с. 45], то антыпрыказкі, на нашу думку, гэта свайго роду крывое люстэрка жыцця сучаснага грамадства, у іх у гратэскным выглядзе адлюстраваны найбольш важныя для сённяшняга чалавека праблемы асэнсавання навакольнага свету, сябе і свайго месца ў свеце.

Прадметна-тэматычная класіфікацыя антыпрыказак вымагае іерархічнага падыходу, што адпавядае пабудове моўнай карціны свету, у якой уяўленні аб рэчаіснасці суадносяцца паводле дыхатамій "род – від", "агульнае – прыватнае", "частка – цэлае" і да т.п. Чыннікам успрыняцця пэўных рэалій у пэўнай якасці з'яўляюцца акрамя аб'ектыўна існуючых сувязей паміж рэаліямі яшчэ і суб'ектыўныя асацыяцыйныя сувязі паміж імі, абумоўленыя сацыяльным і духоўным вопытам грамадства.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Беларускія антыпрыказкі паводле зместу мэтазгодна дыферэнцыраваць на 9 галоўных прадметна-тэматычных блокаў: "Дзяржава. Улада. Палітыка", "Эканоміка. Фінансы", "Вытворчасць. Праца", "Жыццё грамадства. Сацыяльныя з'явы, працэсы", "Свет чалавека. Існаванне, асаблівасці, адносіны", "Чалавек. Людзі. Зносіны", "Духоўнае жыццё", "Свет. Быційныя катэгорыі. Абстрактныя паняцці", "Непазнанае". Кожны з блокаў падзяляецца на некалькі прадметна-тэматычных груп, якія, у сваю чаргу, размяжоўваюцца на падгрупы па больш вузкіх прадметных тэмах.

Неабходна адзначыць, што некаторыя антыпрыказкі адначасова могуць адносіцца да двюх розных тэматычных груп або падгруп. Напрыклад, адзінкі, якія адносяцца да групы "сяброўства", могуць уваходзіць у наступныя групы: "грошы" – (1) *Хутка знойдзе мільён "сяброў" той, хто мае мільён рублёў*; "карысць" – (2) *Скажы мне, хто твой сябра, і я скажу табе, чым ты можаш быць мне карысным*, "п'янства" – (3) *Адзін друг заўсёды лепей за трох, бо тры, калі наведваюцца ў госці, з'ядуць і вып'юць у тры разы больш*; "сямейныя адносіны" – (4) *Новых сяброў нажывай, а старых ад жонкі адганяй*. Гэта не супярэчыць іерархічнаму падыходу да прадметна-тэматычнай класіфікацыі, паколькі антыпрыказкі, таксама як і прыказкі, азначаюць не асобныя прадметы, а цэлыя сітуацыі, што складаюцца з некалькіх рэалій, якія могуць адносіцца да розных прадметна-тэматычных сфер. Аднясенне антыпрыказак да тых ці іншых прадметна-тэматычных груп абапіраецца на вылучэнне пэўнай дамінантнай тэмы. Паводле гэтага прынцыпу антыпрыказкі (3) і (4) былі аднесены да групы "сяброўства", а (1) і (2) – да груп адпаведна "грошы" і "карысць".

Беларускія антыпрыказкі падзяляюцца на наступныя прадметна-тэматычныя групы (з адзначэннем іх колькаснай прадстаўленасці).

**1 Дзяржава. Улада. Палітыка** (6%). 1.1 Законы, праваахоўныя органы (2,5%) – *За морам цялушка – паўгроша, але ж мытня не спіць.* 1.2 Дзяржаўныя і грамадскія дзеячы (1,9%) – *Куды не кінь – усюды Клінтан. Моніка Левінскі.* 1.3 Выбары. Праграмы, палажэнні і мэты дзейнасці палітычных партый, дзеячаў (0,9%) – *У выбарах галоўнае не перамога, а ўдзел.* 1.4 Узброеныя сілы. Вайна (0,7%) – *Наш прапаршчык нічога не пакідае на заўтра, што можна сцягнуць сёння.*

**2 Эканоміка. Фінансы** (5,7%). 2.1 Грошы (2,1%) – *Ня май сто рублёў, а май сто даляраў.* 2.2 Інфляцыя (0,7%) – *Учора былі вялікія, але па 5, а сёння маленькія, але па 50.* 2.3 Рынычная эканоміка (0,5%) – *На чужы базар са сваімі цэнамі не ходзяць.* 2.4 Падаткі (0,5%) – *Нязваны госьць лепей, чым падатковы інспектар.* 2.5 Рэвізоры (0,4%) – *Адзін – з сошкай, сёмера – з праверкай.* 2.6 Прыбытак, расход (0,2%) – *Салодкая яда – жывату бяда, а кандытару прыбытак.* 2.7 Дармаўшчына (0,6%) – *Траянскаму каню глядзяць не ў зубы, а пад хвост.* 2.8 Багацце, беднасць (0,7%) – *Ні кала ні двара, толькі віла на Канарах.*

**3 Вытворчасць. Праца** (5,5%). 3.1 Сельская гаспадарка (1,6%) – *Цяпер і адзін у полі воін, калі ён трактарыст ці камбайнёр.* 3.2 Праца (3,9%): 3.2.1 Адносіны да працы (0,8%) – *Праца з малпы зрабіла чалавека, з каня – транспарт. Тут як пашанцуе*; 3.2.2 Якасць працы, бракаробства, майстэрства (1,6%) – *Справа майстра баіцца, а ад бракароба бяжыць*; 3.2.3 Адносіны паміж працаўнікамі (0,2%) – *Варона казлу не таварыш, але ў адной канторы разам працаваць могуць*; 3.2.4 Беспрацоўе, працаўладкаванне (0,6%) – *Век жыві, век вучыся, беззработным памрэш*; 3.2.5 Аплата працы (0,5%) – *Не месца ўпрыгожвае*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*чалавека, а зарплата*; 3.2.6 Павага да працы (0,2%) – *Не кідай грошай на вецер! Паважай працу дворніка!*

**4 Жыццё грамадства. Сацыяльныя з'явы, працэсы** (22%). 4.1 Сацыяльная іерархія (3,6%): 4.1.1 Адносіны паміж начальнікам і падначаленымі (1,4%) – *У лазні ўсе роўныя. Таму начальства наведвае саўну*; 4.1.2 Пасада, статус, кар'ера (1,8%) – *Рыхтуй сані летам, а пасаду з маладу!*; 4.1.3 Сувязі (0,4%) – *Сустракаюць па адзенні, а праводзяць па сувязях*. 4.2 Адмоўныя сацыяльныя з'явы (8,1%): 4.2.1 Злачыннасць (3,9%): а) Крымінальны свет (1,5%) – *Клан кланам выбіваюць*; б) Карупцыя, хабарніцтва (0,7%) – *Салаўінымі песнямі хабар не бяруць*; в) Махлярства, крадзеж, прысваенне (1,7%) – *"Не хлебам адным будзе сыты чалавек", – мовіў повар і дабавіў у катлеты мяса*; 4.2.2 Шкодныя звычкі (3,8%): а) Курэнне (0,1%) – *Адзін грам нікаціну забівае каня. Так яму і трэба: хай не курыць*; б) П'янства (3,7%) – *Там, дзе добрая самагонка, не парвецца, тое, што тонка*; 4.2.3 Наркаманія (0,4%) – *Узяўся за гуж – забудзь пра "калёсы"*. 4.3 Ахова навакольнага асяроддзя. Экалогія. Мутацыя (2%) – *Беражы лес ад пажараў, бо не будзе з чаго рабіць запалкі!* 4.4 Адукацыя, студэнцтва, навука (1,5%) – *У сямі нянек дзіця без дыплому*. 4.5 Медыцына. Касметалогія (1,2%) – *Сэрца – не камень. Кардыёлаг – не геолаг*. 4.6 Камунальная гаспадарка (0,4%) – *Як прыйшоў Спас – плаці за газ*. 4.7 Сацыяльныя гарантыі і кампенсацыі (0,3%) – *Сонца свеціць, ды ня грэе. Адпачынак грэе, ды ня сьвеціць...* 4.8 Міграцыя. Горад і вёска (0,3%) – *Смеласць бярэ гарады. Вось чаму ў вёсцы застаюцца адны нясмелыя*. 4.9 Сродкі масавай інфармацыі (0,4%) – *Кнігі робяць чалавека разумным, а газеты – нервовым*. 4.10 Інфармацыйныя тэхналогіі (1,1%) – *Камп'ютэр камп'ютэру не таварыш, а вірусаносьбіт*. 4.11 Дарога, рух, транспарт, паводзіны на дарозе, перамяшчэнне (2%) – *Аўтамабіль – не раскоша, але жабраком зрабіць можа...* 4.12 Мабільная сувязь (0,1%) – *Абанент не адказвае ці часова недасяжны. Паспрабуйце больш не тэлефанаваць*. 4.13 Дасуг (0,9%), Турызм (0,2%), Дыскатэка (0,1%), Спорт (0,6%) – *Шлях да сэрца балельшчыка ляжыць праз вароты праціўніка*.

**5 Свет чалавека. Існаванне, асаблівасці, адносіны** (21,5%). 5.1 Жыццё, смерць (2%) – *Жыццё кароткае. Пацярпі трошкі!* 5.2 Лёс, прызначэнне (1,7%) – *Кожны мужчына за сваё жыццё "павінен": выхаваць жонку, вырасціць жывот, пасадзіць печань*. 5.3 Кожнаму сваё (0,7%) – *Кожнаму сваё: агульнага няма!* 5.4 Сваё, чужое (0,6%) – *Адзін у чужым полі не воін*. 5.5 Узрост, маладосць, старасць (0,6%) – *І малады конь баразны не сапсуе, калі будзе стаяць у стойле*. 5.6 Здольнасці, патрэбнасці (1,1%) – *Народжаныя поўзаць лятаць не могуць. Затое могуць вельмі высока запаўзаць*. 5.7 Натура, яе праяўленне, менталітэт (0,5%) – *Пазнаюць птушку па памёце*. 5.8 Розум. Веды. Пазнанне (4,8%): 5.8.1 Дурань, глупства, мудрасць, розум (2,9%) – *Хто смяецца апошнім? Той, да каго пазней даходзіць...*; 5.8.2 Вучэнне, атрыманне ведаў (0,9%) – *Колькі не вучыся, усё роўна болей за тэлевізар ведаць не будзеш*; 5.8.3 Вопыт (0,6%) – *Хто апарыўся на малацэ, той і на карову дзьме*; 5.8.4 Роздум (0,4%) – *Падумай, перш чым падумаць!* 5.9 Здароўе (1,5%): 5.9.1 Здароўе, захворванні (1%) – *Здароўе за грошы не прадасі*; 5.9.2 Здаровы лад жыцця (0,1%) – *Вып'ем за здаровы лад жыцця!*; 5.9.3 Гігіена (0,4%) – *Мыйце рукі перад ежай. Нямытыя рукі есці шкодна*. 5.10 Быт (8%): 5.10.1 Дом, жыллёвыя ўмовы (0,3%) – *Мой родны кут, як ты мне мілы, / Але без грошай і віна. / Зрабіць рамонт не маю сілы, / Хоць абвалілася сцяна*; 5.10.2 Дача, прысядзібная

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гаспадарка (0,5%) – *Што пасееш, тое і збяруць суседзі па дачы*; 5.10.3 Хатнія жывёлы (0,6%) – *Маленькі сабачка, а гаспадара моцна тузае*; 5.10.4 Харчаванне (2,9%) – *Байкар салаўём сыты не будзе*; 5.10.5 Дыета, лішняя вага (0,5%) – *Прападае кату масленіца, калі гаспадыня на дыеце*; 5.10.6 Знешнасць, аблічча, фізічныя недахопы (1,5%) – *Адна галава добра, а адна нага – блага*; 5.10.7 Адзенне (0,6%) – *Не адзенне чалавека, а чалавек адзенне псуе*; 5.10.8 Чысціня, ахайнасць (0,2%) – *І на сонцы ёсць плямы. Бо там яшчэ няма "Комет-геля"*; 5.10.9 Страваванне, фізіялагічныя працэсы (0,9%) – *Які стол, такі й стул.*

**6 Чалавек. Людзі. Зносіны** (17,2%). 6.1 Чалавек, людзі, асяроддзе (1%) – *Чалавек – гучыць горда, робат – перспектыўна.* 6.2 Мужчына. Жанчына (1,9%) – *Мужчыны пазнаюцца ў грашах.* 6.3 Каханне. Інтымныя адносіны. Секс (6,8%) – *Каханне – не раскоша, а самы надзейны метад пазбавіцца ад уласных грошай.* 6.4 Сям'я (3,1%): 6.4.1 Сямейныя адносіны. Муж, жонка, сваякі (2,4%) – *Чым бы жонкі ні цешыліся, абы толькі мужы не плакалі*; 6.4.2 Бацькі і дзеці (0,7%) – *Чым бы дзіця ні цешылася, абы бацькі не плакалі.* 6.5 Сяброўства, варожасць (1,6%) – *Сябры спазнаюцца ў бядзе... Ці калі табе трэба паручальнікі.* 6.6 Госці (0,4%) – *Колькі госця ні кармі, усё роўна нап'ецца.* 6.7 Дасягненне згоды, перакананне (0,5%) – *Будуць і ваўкі сытыя, і авечкі цэлыя, калі ёсць казёл адпушчэння.* 6.8 Мова. Слова (1,9%) – *Слова – не верабей, выскачыць – і не падумаю лавіць. Трандычыха.*

**7 Духоўнае жыццё** (17,6%). 7.1 Вера. Бог. Царква. Рэлігія (1,3%) – *Беражонага і бог беражэ, – сказаў бацюшка, застрахаваўшы сваё жыццё.* 7.2 Мастацтва (1,6%) – *З песні слова не выкінеш, у фанаграму не ўставіш.* 7.3 Эстэтыка (0,7%) – *Прыгажосць – страшэнная сіла. Баба-Яга.* 7.4 Мараль (14%): 7.4.1 Этычныя катэгорыі (3,6%): а) Дабро, зло (0,7%) – *Дабро абавязкова пераможа зло, паставіць на калені і па-звярынаму заб'е*; б) Лепшае, добрае, дрэннае (0,9%) – *Усе, што робіцца, – да лепшага. А не робіцца абсалютна нічога*; в) Шчасце, удача, няшчасце (1%) – *Не ганяйся за шчасцем, няхай яно бегае за табой*; г) Ісціна, праўда (0,9%) – *Праўду ў вочы лепей казаць па тэлефоне*; д) Аўтарытэт (0,1%) – *Распаўсюджвай пра сябе добрыя слухі. Крыніца забудзецца, а сэнс застанецца*; 7.4.2 Маральныя якасці, рысы і праяўленне характару, эмоцыі (10,4%): Адказнасць (0,3%); Альтруізм (0,1%); Аптымізм (0,1%); Вернасць (0,4%); Гонар (0,1%); Дапамога, ратаванне (0,5%) – *Груган гругану вока не пазычыць*; Дармаедства, гультайства (1,6%) – *Лепей есці, чым працаваць*; Зайздрасць (0,1%) – Імкненні да велічы, славы (0,1%); Карысць (0,4%); Нахабства (0,1%); Падхалімства (0,4%); Патрыятызм (0,2%); Прагнасць (0,4%); Прадбачлівасць, перасцярога (1,9%) – *Не падаслаўшы саломкі, не падай*; Смеласць, страх (0,5%) – *Напужаная варона і вераб'я перапужае*; Смех, усмешка (0,6%) – *Смех – не грэх? А калі грашыць з усмешкай?*; Сорам (0,2%); Спачуванне (0,1%); Спех (0,4%); Сумленне (0,7%) – *Калі сумленне прачнулася, прымусь яго зрабіць фіззарадку*; Сціпласць (0,2%); Увага, спрыт, кемлівасць, промах (0,7%) – *Пакуль сем разоў адмераеш, не адзін тлусты кавалак адрэжуць*; Эканомнасць, беражлівасць (0,3%).

**8 Свет. Быційныя катэгорыі. Абстрактныя паняцці** (4,4%). 8.1 Свет (0,2%): *"Што ж у гэтым свеце не так?" – думаў Калабок, пераможваючы лісу.* 8.2 Час. Вечнасць. Мінулае, сучаснае, будучае (0,8%) – *Калі не ў казцы сказаць, ні пяром апісаць, значыць, гэта наша будучыня.* 8.3 Своечасовасць, дачаснасць (1%) – *Спазніцца ніколі не позна.* 8.4 Неабходнасць, магчымасць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(0,5%) – *Як мука спатрэбіцца, дык усё перамелецца.* 8.5 Якасць, колькасць (0,3%) – *Не ўсё тое золата найвышэйшай пробы, што блішчыць.* 8.6 Аднолькавае, рознае (0,9%) – *Клін клінам заганяюць.* 8.7 Многа, мала, мноства (0,3%) – *I тут пуста, і там не густа.* 8.8 Новае, старое (0,2%) – *Новае – гэта рэабілітаванае старое.* 8.9 Правіла (0,1%) – *Кожнае выключэнне мае сваё правіла.* 8.10 Парадак (0,1%) – *Воўк лічанае бярэ. Ведае: захочуць – наноў пералічаць.*

**9 Непазнанае** (0,2%) – *А зомбі тут ціхія*; *Аднаго біяполя ягады.*

## Заключэнне

Змест беларускіх антыпрыказак прысвечаны актуальным праблемам у сацыяльным і культурным жыцці беларусаў, адносінам носьбітаў мовы да таго, што адбываецца на Беларусі і ў свеце. Прадметна-тэматычныя групы беларускіх антыпрыказак з'яўляюцца ўзаемазалежнымі і ўзаемаабумоўленымі, суадносяцца паводле прынцыпу іерархіі, што адлюстроўвае аб'ектыўную іерархію паняццяў і каштоўнасцей, якія выступаюць найбольш значнымі для сучасных носьбітаў мовы. Розныя прадметна-тэматычныя групы маюць неаднолькавую колькасную прадстаўленасць, што паказвае на прадуктыўнасць адлюстравання ў мове тых ці іншых сфер сацыяльнага і духоўнага жыцця сучаснага чалавека, яго ўяўленняў і каштоўнасцей.

Прыкладна роўнымі па сваёй колькаснай напаўняльнасці з'яўляюцца прадметна-тэматычныя блокі "Жыццё грамадства. Сацыяльныя з'явы, працэсы" (22% ад агульнай колькасці антыпрыказак), "Свет чалавека. Існаванне, асаблівасці, адносіны" (21,5%), "Духоўнае жыццё" (17,6%), "Чалавек. Людзі. Зносіны" (17,2%). Найменш колькасна прадстаўлены прадметна-тэматычныя блокі "Свет. Быційныя катэгорыі. Абстрактныя паняцці" (4,4%) і "Непазнанае" (0,2%).

Да найбольш актуальных сфер жыцця сучаснага грамадства адносяцца, паводле іх колькаснай прадстаўленасці ў беларускіх антыпрыказках, наступныя: "Маральныя якасці, праяўленне і рысы характару, эмоцыі" (10,4%); "Быт" (8%); "Адмоўныя сацыяльныя з'явы" (8,1%), у тым ліку "Злачыннасць" (3,9%), "П'янства" (3,7%); "Каханне. Інтымныя адносіны. Секс" (6,8%), "Сацыяльная іерархія" (3,6%), "Сям'я" (3,1%).

Многія з прадметна-тэматычных груп беларускіх антыпрыказак зместава супадаюць з прадметна-тэматычнымі групамі прыказак (паводле існуючых парэміялагічных зборнікаў), але колькасны склад прыказак і антыпрыказак аднолькавай тэматыкі істотна адрозніваецца. Так, у зборніку Ф.М. Янкоўскага [4] напаўняльнасць прадметна-тэматычных груп прыказак (у параўнанні з антыпрыказкамі) наступная: "Злачыннасць" – 0,6% (параўн. 3,9%), "П'янства" – 0,8% (3,7%), "Каханне" – 0,3% (6,8%), "Сацыяльная іерархія (няроўнасць)" – 5,1% (3,6%), "Сям'я" – 6,6% (3,1%). Гэта сведчыць аб змяненні сацыяльных і духоўных прыярытэтаў, каштоўнасцей і арыентацый сучаснага беларускага грамадства.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Walter, H.*** Анти-пословицы в современной живой русской речи / H. Walter, V. Mokienko // Wörterbuch russischer Anti-Sprichwörter. Lehrmaterial für Studenten der Slawistik. – Greifswald: Institut für Slawistik, 2002. – С. 3-24.
2. ***Mieder, W.*** Antisprichwörter / W. Mieder. – Wiesbaden: Verlag für deutsche Sprache, 1982. – Band I. – 235 s.
3. ***Dundes, A.*** Interpreting folklore / A. Dundes. – Bloomington: Indiana University Press, 1980. – 304 p.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф.М. Янкоўскі; прадм. Д.Я. Бугаёва. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 494 с.

Паступіў у рэдакцыю 28.05.2010 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова